*Вольга Прыемка*

# АБ ПРАЦЫ СЕМІНАРА

25 верасня 2014 года на базе філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў праведзены другі навукова-практычны семінар «Сучасная фалькларыстыка, міфалогія, этналогія: пазітыўныя, негатыўныя, супярэчлівыя вектары руху». Яго праблемнае поле – «Фальклор і хрысціянская культура». Арганізатарамі правядзення семінара выступілі кафедра тэорыі літаратуры (загадчык – прафесар В. П. Рагойша), вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору (загадчык – В. І. Палукошка) і студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя «Фалькларыстыка» (загадчык – дацэнт В. В. Прыемка).

У склад Аргкамітэта семінара ўвайшлі:

старшыня – В. П. Рагойша, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры тэорыі літаратуры БДУ;

намеснік старшыні – Т. А. Марозава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры БДУ;

распрацоўка канцэпцыі семінара – Р. М. Кавалёва, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры БДУ;

члены аргкамітэта – В. В. Прыемка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры БДУ; Т. В. Лук’янава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры БДУ; С. В. Шамякіна, кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры тэорыі літаратуры БДУ; В. І. Палукошка, магістр філалогіі, навуковы супрацоўнік вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры БДУ; В. І. Лынша, супрацоўнік кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта БДУ; Н. Л. Канабеева, магістр філалогіі, супрацоўнік вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору; М. Ю. Латышкевіч, магістр філалогіі, аспірант кафедры тэорыі літаратуры, супрацоўнік вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору (тэхнічнае забеспячэнне).

Заяўкі на ўдзел у семінары падалі 29 чалавек: 4 – на пленарнае пасяджэнне, 25 – паведамленні на круглы стол і на працу ў якасці дыскутантаў.

Парадак работы семінара прадугледжваў правядзенне наступных мерапрыемстваў:

1. Пленарнае пасяджэнне.
2. Кніжная выстава «Духоўная літаратура і культура».
3. Прэзентацыя зборніка «Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі». Выпуск 11.
4. Круглы стол «Дыялог язычніцкай і хрысціянскай культур у сэнсавым полі фальклору: міф або рэальнасць?».
5. Паэтычна-музычная імпрэза Ганны Чумаковай «Л…».

У рабоце пленарнага пасяджэння і круглага стала ўзялі ўдзел магістранты, выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі з сямі ВНУ рэспублікі (БДУ ў складзе філалагічнага, філасофскага і гуманітарнага факультэтаў, а таксама Інстытута журналістыкі; БДПУ імя М. Танка ў складзе факультэта эстэтычнага выхавання і аддзела тэорыі і гісторыі беларускай культуры; БДУКіМ у складзе факультэта традыцыйнай народнай культуры і сучаснага мастацтва; БДАМ у складзе факультэта музычнага мастацтва; БДМУ у складзе ваенна-медыцынскага факультэта; БрДу імя А. С. Пушкіна ў складзе філалагічнага факультэта; ГрДУ імя Я Купалы ў складзе факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму) і адной навуковай установы (ДНУ «Цэнтр даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»).

З прывітальным словам да ўдзельнікаў семінара звярнуўся дэкан філалагічнага факультэта БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар І. С. Роўда. У ролі вядучага пленарнага пасяджэння выступіла кандыдат філалагічных навук, дацэнт В. В. Прыемка.

На пленарным пасяджэнні выступілі:

***Тацяна Іванаўна Шамякіна***, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры сучаснай беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, з дакладам **«Язычніцтва і хрысціянства ў гісторыі»**;

***Аляксандр Уладзіміравіч Марозаў***, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры міжкультурных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, з дакладам **«Социокультурный контекст функционирования духовных стихов в славянском мире»**;

***Аляксандр Уладзіміравіч Дуброўскі***, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, з дакладам **«Дыялог як багаслоўская катэгорыя ў кантэксце хрысціянскай місіі: біблеістычны і місіялагічны аспекты»**;

***Лілія Фаільеўна Баранкевіч***, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры беларускай музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, з дакладам **«Дуализм поминальных духовных стихов»**.

Пленарнае пасяджэнне суправаджалася відэарадам: паказам фотаздымкаў і відэафільма «Сакральныя камяні». Пра помнікі «народнага хрысціянства» паводле экспедыцый Этнагістарычнага Цэнтра «Явар» (2000 – 2014 гг.) расказалі кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі **Людміла Уладзіміраўна Дучыц** і навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі **Ірына Яўгенаўна Клімковіч**.

Кніжная выстава «Духоўная літаратура і культура» была падрыхтавана супрацоўнікамі чытальнага зала бібліятэкі філалагічнага факультэта БДУ. Агляд літаратуры па тэме семінара правяла загадчыца бібліятэкі філалагічнага факультэта БДУ **Жанна Сцяпанаўна Карповіч**. З прэзентацыяй зборніка «Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі. Выпуск 11» выступіла складальнік зборніка кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Вольга Віктараўна Прыемка**.

Мадэратарамі на Круглым стале выступілі доктар філасофскіх навук, прафесар, прафесар кафедры фальклору і этналогіі БДУКіМ **Энгельс Канстанцінавіч Дарашэвіч** і кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры БДУ **Рыма Мадэстаўна Кавалёва** . Праблемнае пытанне было наступнае: «Дыялог язычніцкай і хрысціянскай культур у сэнсавым полі фальклору: міф або рэальнасць?» Былі заслуханы паведамленні, прайшла актыўная дыскусія. Сярод прысутных найбольшую цікавасць выклікалі паведамленні старшага выкладчыка кафедры журналістыкі факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Я. Купалы **Ганны Віктараўны Жагала** «Язычество и христианство в свете феноменологии диалога» і кандыдата філалагічных навук, дацэнта, дацэнта кафедры тэорыі літаратуры БДУ **Рымы Мадэстаўны Кавалёвай** «Задачы фалькларыстыкі ў святле дыялогу язычаскай і хрысціянскай культур»

У дыскусіі прынялі ўдзел доктар філалагічных навук, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі **Таццяна Васільеўна Валодзіна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай літаратуры

філалагічнага факультэта БДУ **Ульяна Юр'еўна Верына**, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры філасофіі культуры філасофскага факультэта БДУ **Святлана Генадзьеўна Карасёва**, магістр філалогіі, супрацоўнік вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта БДУ **Маргарыта Юр’еўна Латышкевіч** і іншыя ўдзельнікі семінара.